

Жыве Беларусь!

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№119 (632) 22 чэрвеня 1993 г. Аўторак. | Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах. | Тыраж 617155 экз. | Кошт у розніцу — 4 руб.

ФАКС

Вкратце

Многочисленная делегация турецких бизнесменов во главе с вице-президентом Торговой палаты Стамбула М.Ильдримом посетила Беларусь.

Между Торговой палатой Стамбула и Торгово-промышленной палатой Беларуси подписано соглашение о сотрудничестве.

❑

Чрезвычайный и Полномочный Посол Республики Беларусь в Российской Федерации Виктор Даниленко и Чрезвычайный и Полномочный Посол Республики Индонезия в России Январ Марох Джани подписали в Москве совместное коммюнике об установлении дипломатических отношений между Беларусью и Индонезией.

Эти отношения будут развиваться на основе принципов и задач статуса ООН, а также Венской конвенции о дипломатических отношениях 1961 года.

❑

В Минске в штаб-квартире СНГ прошла международная рабочая встреча по проблемам борьбы с наркобизнесом.

Обсуждены меры по практической реализации международного соглашения, принятого в прошлом году в Киеве.

❑

Сегодня начинается организованный Министерством информации четырехдневный семинар редакторов объединенных и районных газет Беларуси.

Будут организованы "круглые столы", деловые встречи, дискуссии. Участники семинара прослушают лекции, обменяются опытом журналистской работы.

❑

24 июня в Минске в помещении информационно-культурного центра пройдет второй съезд Белорусского научно-производственного конгресса.

На обсуждение съезда выносятся проект экономической концепции БНПК и вопросы подготовки к предстоящим выборам в органы власти.

❑

Грандиозный молодежный праздник пройдет 26 и 27 июня в Бресте в честь Дня молодежи.

Разнообразная, оригинальная программа завершится рок-фестивалем "Берестейская ярмарка", участие в котором примут известные белорусские рок-группы "Крама", "Улис", "Вокзал" и "Талер".

Сверху виднее...

Госсекретарь США Уоррен Кристофер призывает союзников по НАТО предоставить их военно-воздушные силы для защиты войск ООН, охраняющих "зоны безопасности", созданные для преимущественно мусульманского населения в охваченной войной Боснии и Герцеговине.

Эта операция будет координироваться Соединенными Штатами, которые, однако, решили воздержаться от любой военной или даже тыловой роли на суше.

С вашим-то темпераментом!

Первый в республике парфюмерный магазин всемирно известной французской компании "Ив Роше Париж" открывается в Гомеле в начале следующего месяца.

Здесь будет представлен по умеренным ценам широкий ассортимент косметики из натурального растительного сырья. Гомельчанки смогут даже с учетом цвета волос, типа кожи, темперамента подобрать себе омолаживающие кремы из коллекций "Антарктик", "Триморан", "Частная жизнь".

Анатолий ГОТОВЧИЦ.

Спорт-экспресс

Очередная сессия Верховного Совета приняла во втором чтении Закон Республики Беларусь "О физической культуре и спорте".

❑

УЕФА на состоявшемся в Женеве конгрессе принял в свои ряды федерации Беларуси, России, Украины, Словении, Хорватии, Армении и Грузии.

❑

Игорь Гуринович, выступающий сейчас за польский клуб ЛКС (Лодзь), встретился со своими бывшими одноклубниками из "Торпедо". Минский клуб, согласно предварительной договоренности, отправился в минувшее воскресенье в Польшу, где проведет тренировочные сборы.

Как бы в тюрьму не "закосили"

Если раньше уклонение от призыва в армию имело единичные случаи, то в последнее время это приобретает массовый характер.

На сегодня, например, более 90 парней, которые подлежат призыву, чтобы не служить, ушли в "подполье". К дизертирам начинают применяться строгие меры. Так, решением прокуратуры Октябрьского района Могилева двое парней-призывников, не желающих служить, арестованы. Против них возбуждено уголовное дело.

Николай КОМЛЕВ.



Рисунок Олега ПОПОВА.

Вход на КПП — слева от ресторана

Около десятка хулиганов нагрянули поздно вечером на КПП Витебского полка военно-транспортной авиации, избили дежурного, пытались проникнуть на территорию части.

Подоспевшему прапорщику пришлось пострелять в воздух и вызвать милицию. Показательно, что пьяные злоумышленники вышли на "дело" из находящегося в нескольких шагах от КПП военторговского ресторана, где еще недавно была обычная столовая.

Сергей БУТКЕВИЧ.

Косят инициативу КОСов

Похоже, Закон о местном самоуправлении нашим чиновникам пока не писан.

Именно к такому выводу пришло собрание Движения за территориальное самоуправление, направившее в белорусский парламент обращение.

В нем, в частности, говорится о фактах игнорирования инициативы граждан, абсурдной практике изымания части доходов КОСов в районный бюджет...

Константин УЛЬЯНОВ.

Класс с "незапятнанной биографией"

Абитуриентов для Академии МВД Беларуси решила готовить гомельская СШ N 22.

Здесь открывается специальный 10 "Б" — "правовой класс", отбор в который будет проходить на конкурсной основе, причем немаловажное значение для желающих в нем учиться будет иметь успешное прохождение специальной медкомиссии и отсутствие в биографиях конфликтов с законом.

Хотели как лучше...

Перестали собирать таможенные платежи за ввоз и вывоз продукции на границах Беларуси.

Но это совсем не означает, что республика "открыла" свои рубежи. Плата не берется временно, потому что сразу же после введения новых ставок налога на экспорт и импорт правительству пришлось приостановить их действие. Выяснилось, что налоги, которые предназначены были охранять от иностранных конкурентов белорусских производственников, наоборот, больно ударили по последним. В ближайшее время появится новый документ, в котором будут исправлены ошибки. А пока...

Наталья НЕВИДОМАЯ.

А на часиках — автопортрет...

На пинском заводе "Камертон" начали выпуск электронных часов в соответствующем оформлении по специальным заказам — к знаменательным датам.

На стекломаске к часам заказчик волен изобразить все, что пожелает, думается, в пределах этических норм. Уже изготовлены партии таких часов для военных моряков, к съезду санитарных врачей и др. А в планах — разработка юбилейного экземпляра к 900-летию родного города.

Светлана СТАХОВСКАЯ.

Храните валюту в сбербанке!

Казалось бы, ну что может быть интересного для вора в заводском комитете Союза молодежи?

Однако, как заявил сотрудникам милиции лидер молодежного движения могилевского завода "Техноприбор", неизвестный, проникший в его рабочий кабинет, украл 4650 долларов США, принадлежавших лично хозяину кабинета.

Борис МИХЕЕВ.

Возвращение святой Варвары

Витебские католики получили постоянное место для богослужений.

Реставрация костела св. Варвары, возведенного в прошлом веке за восемь месяцев, заняла около пяти лет и завершилась торжественным освящением храма.

Степан СТАРОЖИЛ.

Играй, гармонь!

В деревне Ботвиново Чечерского района состоялся смотр-конкурс гармонистов и исполнителей народных припевок.

Конкурс собрал более 40 участников. Победителем стал самодеятельный коллектив "Чачэрскі гармонік".

Анатолий ИВАНОВ.

Выпуск подготовлен по сообщениям корреспондентов "Народной газеты", агентств ИТАР—ТАСС, Белинформ, БелаПАН и РИД.

У нядзелю на плошчы Незалежнасці

Выдатнай службы, лейтэнанты!

❑

Пазаўчора амаль дзве сотні выпускнікоў Мінскага вышэйшага ваеннага камандная і інжынернага вучылішчаў атрымалі дыпломы і сталі лейтэнантамі. Адбылася гэтая падзея ва ўрачыстай абстаноўцы на сталічнай плошчы Незалежнасці пры адпаведнай колькасці родных, сяброў і знаёмых маладых афіцэраў. Да дыплома кожны лейтэнант атрымаў віншаванні і кветкі ад бацькоў і каханых.

Фота Ігара ІВАНОВА.

❑



Что под грифом секретности?

Владимир ТАРАСОВ: "Национальная валюта — главное условие продвижения реформ"

Редакции стало известно, что с прошлого года в республике разрабатывалась программа проведения денежной реформы и введения национальной валюты. Наш корреспондент Владимир САМОЙЛОВ встретился с руководителем рабочей группы по разработке этой программы, заместителем директора Института экономики АН Беларуси, доктором экономических наук Владимиром ТАРАСОВЫМ.

— Владимир Иванович, знаю, что документы, которые рождались в вашей группе, помечались грифом "секретно". С чем это связано? Неужели проблема введения национальной валюты, которая обсуждается сегодня едва ли не на каждом углу, попала в разряд государственных тайн?

— Думаю, что это была не такая уж секретная работа, если, например, вы знаете об этом. Но в целом по некоторым причинам работа группы не афишировалась...

— Почему?

— Опыт проведения подобных мероприятий в других государствах говорит о том, что излишняя гласность вредит делу. Возьмем, к примеру, "молниеносную" денежную реформу Эрхарда, проведенную после второй мировой войны. Она решила проблему инфляции и выхода из экономического кризиса. И это в послевоенной разрушенной Германии...

—Так что больше способствовало этому? Тайна при подготовке или все же американские деньги?

— Думаю, и то, и другое. Но, конечно, основную роль сыграли мероприятия, проведенные в рамках "Плана Маршалла".

— Тайнами и у нас, как известно, мастера любое дело обставлять, а как насчет планов, которые могли бы сравниться по уровню со знаменитым "Планом Маршалла" и так же быстро вывести нас из тупика?

— С этим дело обстоит сложнее. Вы сами видите, что около трех лет так называемых рыночных преобразований не привели к созданию действительно рыночных отношений, рыночной инфраструктуры и всего того, что хотя бы приблизительно напоминало рынок. Этого можно было достичь, если бы рыночные преобразования проводились радикально и комплексно, в том числе сопровождались введением полноценной национальной валюты.

— Другими словами, национальная валюта — панацея от всех бед?

— Нет, конечно, но она позволяет проводить независимую государственную денежно-кредитную политику, которая, конечно, может быть более или менее эффективной. Но в данном случае отсекаются все возможности свалить неудачи, например, на "дядю", который сидит в Центральном банке России и даже во сне видит, как бы нас ущемить.

— Чем же занималась конкретно ваша группа? Определяла рисунок и форму будущих купюр?

— Технически разработать и отпечатать деньги не представляет большой сложности. Гораздо труднее разработать чисто экономическую сторону данного, не побоюсь этого слова, исторического для нашей республики мероприятия. Например, проработать варианты ликвидации дефицита госбюджета. Рассчитать начальный обменный курс национальной валюты к основным валютам мира. Определить минимальный размер валютных резервов для обеспечения устойчивости национальной денежной единицы. Ну, и самое главное: разработать процедуру проведения денежной реформы.

— К каким же выводам конкретно пришла рабочая группа? Ну, например, есть ли у нас минимальный золотой или валютный резерв для обеспечения устойчивости своих денег?

— Как известно, золотого запаса у нас нет. Может, и был бы, если бы Россия не присвоила нашу часть золотого запаса СССР. Кстати, мы исследовали этот вопрос на заседаниях нашей группы...

Что касается необходимого резерва "сильной" иностранной валюты, то и здесь нам похвастаться нечем. По подсчетам республике необходимо 450—600 миллионов долларов в качестве резерва, а на данный момент валютного запаса в республике практически нет. Так, например, в этом году отчисления в государственный валютный фонд составят всего около 180 миллионов долларов, но эти деньги будут использованы на решение текущих проблем.

— Так что же, значит, ничего у нас со своей валютой априори не получится?

— Выход есть. Можно, например, обратиться к международным финансовым организациям для получения так называемого реабилитационного беспроцентного кредита для обеспечения устойчивости новых денег. И, как худший вариант, — получение кредита под залог какой-либо части национального богатства.

— Какой объем наличной денежной массы планировалось ввести в оборот сразу?

— При пересчете на рубли, от этой арифметики нам пока не уйти, эта масса должна составить примерно 50-70 миллиардов рублей. Но учтите, расчет делался на начало 1993 года. Сейчас ситуация изменилась.

— А как будет определяться курс новых денег?

— Мы предложили рассчитывать курс к рублю через третью валюту, это так называемый гросс-курс.

— Но можно ли решиться на реформу при таком дефиците бюджета?

— Одной из целей реформы и является ликвидация этого дефицита.

— Так есть надежда, что мир наконец перестанет смеяться над нашими "зайчиками"?

— Рассматривалось несколько возможных вариантов создания настоящей национальной денежной системы.

—Если можно, подробнее...

—Если подробнее, то это займет не одну полосу в вашей газете. А коротко суть их состояла в следующем.

Первый вариант предусматривал полный отказ от использования рубля и осуществление единовременного перехода к своей валюте. При других вариантах предполагалось так называемое эволюционное введение денежной единицы по мере накопления резервов...

Нечто подобное было проведено в начале двадцатых в СССР, когда в результате "медленной" реформы и некоторых "рыночных" мероприятий червонец стал "твердой" валютой...

— А потом...

— А потом к экономистам перестали вообще прислушиваться, страной стали править вульгарные политиканы. Дай Бог нам от этого удержаться в наше время политических страстей и, что еще хуже, политической непримиримости. Сейчас нас спасут только здравый смысл и трезвый экономический расчет.

— Думаю, что ваша работа стала особенно актуальной в свете последнего ультиматума, предъявленного нам Россией. Я имею в виду телеграмму в наш Национальный банк с требованием определиться, наконец, в финансовых вопросах. В итоге мы перед выбором...

— Думаю, выбора нет. Нам нужно максимально быстро вводить свою валюту. Но не только это. Главное — это проведение комплекса взаимосвязанных мероприятий. А этим мы в последнее время не слишком отличались.

— Ну, а по срокам, когда можно ждать реформы?

— Об этом должны знать в стране если и не три человека, то, скажем, очень ограниченный круг лиц...

— Как я понял, наши читатели в этот круг не входят. И все же благодарю за откровенную беседу.

Паведамленне Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па статыстыцы і аналізу

Аб індэксе спажывецкіх цэн

Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па статыстыцы і аналізу паведамляе, што ў маі 1993 года ў параўнанні з красавіком 1993 года індэкс цэн на харчовыя і нехарчовыя тавары і паслугі, уключаныя ў "спажывецкую карзіну", склаў 120,4 працэнта.

У маі 1993 года ў параўнанні са снежнем 1992 года кошт уключаных у мінімальную "спажывецкую карзіну" тавараў і паслуг павялічыўся ў 3 разы.

Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па статыстыцы і аналізу.

Візіты

У Мінску — высокія карэйскія госці

У Мінск з афіцыйным візітам прыбыла дэлегацыя Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі. Яе ўзначальвае старшыня Вярхоўнага народнага сходу КНДР Ян Хен Соб. Паўночнакарэйскіх гасцей прыняў Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслаў Шушкевіч.

Вітаючы дэлегацыю КНДР, кіраўнік беларускага парламента адзначыў, што Беларусь як адна з нашчадкаў былога Савецкага Саюза імкнецца да захавання цёплых дружалюбных адносін з Паўночнай Карэяй, а таксама да пашырэння ўзаемавыгадных гандлёва-эканамічных сувязей. Пакуль што гэтыя сувязі, паводле слоў С.Шушкевіча, знаходзяцца на "мінімальна магчымым узроўні": экспарт беларускіх тавараў у КНДР у мінулым годзе склаў толькі 0,3 працэнта ад усяго аб'ёму паставак Беларусі ў іншыя краіны. А між тым нам ёсць што прадаваць карэйцам і ёсць што ў іх купляць.

Ян Хен Соб удзяліў вялікую ўвагу становішчу КНДР у свеце, у першую чаргу — ядзернай праблеме. У пачатку чэрвеня ў Нью-Йорку праходзілі беспрэцэдэнтныя перамовы паміж прадстаўнікамі Паўночнай Карэі і ЗША, у выніку якіх кіраўніцтва КНДР прыняло рашэнне ўсё ж захаваць вернасць дагавору аб нераспаўсюджанні ядзернай зброі. Гэты крок лідэраў КНДР быў з вялікім адабрэннем сустрэты ва ўсім свеце. Паўночную Карэю, як вядома, падазраюць у намеры абзавесціся ўласнай ядзернай зброяй. Аднак, паводле слоў высокага карэйскага госця, галоўная задача КНДР не ў гэтым, а ў "аб'яднанні расчлененай радзімы" на працягу 90-х гадоў.

Кіраўнік парламента КНДР перадаў прывітанне і найлепшыя пажаданні Станіславу Шушкевічу і ўсяму народу Беларусі ад прэзідэнта КНДР Кім Ір Сена і яго сына, другой асобы ў дзяржаве, Кім Чэн Іра. На думку карэйскага госця, іх візіт на Беларусь, першы пасля атрымання нашай рэспублікай незалежнасці, будзе садзейнічаць умацаванню сувязей і супрацоўніцтва паміж дзвюма дзяржавамі.

— Кожная краіна выбірае свой шлях, які адпавядае пажаданням і надзеям яе народа, — сказаў напрыканцы Станіслаў Шушкевіч.

Цяжка не пагадзіцца са Старшынёй Вярхоўнага Савета: сапраўды, калі мы хочам пабудаваць у сябе дэмакратычную дзяржаву, трэба навучыцца паважаць выбар іншых народаў і ладзіць свае адносіны з імі на аснове нармальнага супрацоўніцтва.

Візіт дэлегацыі КНДР у Рэспубліку Беларусь працягваецца.

Яраслаў ШЫМАЎ.

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Жыві і помні







Так пачалася вайна...

22 чэрвеня чорнай датай увайшло ў гісторыю нашага народа. На плечы народа ляглі чатыры гады вялікіх выпрабаванняў.

Гэтыя здымкі — неабвержныя звесткі тых страшных дзён.

❑ Першая заява з просьбай адправіць на фронт.

❑ Першыя "дзеянні" гітлераўцаў на беларускай зямлі (вёска Ракавіца Брэсцкага раёна).

❑ Бой у наваколлях Астрашыцкага Гарадка пад Мінскам. Чэрвень 1941 года.

Рэпрадукцыі з фотатэкі Белінфарма.

Рэпарцёр даведаўся

Хрысціяне аддаюць перавагу графу

Хоць сёння яшчэ невядома, ці будзе па новай Канстытуцыі ў Рэспубліцы Беларусь пасада прэзідэнта, некаторыя ўжо ўключыліся ў перадвыбарную барацьбу.

16 чэрвеня адбылася сустрэча кіраўніцтва Беларускага хрысціянска-дэмакратычнага саюза з незалежным кандыдатам на пасаду прэзідэнта графам Аляксандрам Прушынскім. Прэтэндэнт пазнаёміў актыў БХДС са сваёй перадвыбарнай праграмай, прапанаваў канкрэтны план вываду рэспублікі з крызіснага стану, выказаўся за пабудову чалавечых адносін на прынцыпах хрысціянскай маралі.

На думку прысутных, на сённяшні дзень БХДС не бачыць лепшага прэтэндэнта на прэзідэнцкую пасаду, чым Аляксандр Прушынскі.

Белінфарм.

Цяпер іх "прапіша" суд?

Калі б не аператыўная работа супрацоўнікаў абласнога аддзела па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю, не абмінуў бы Віцебск дэмаграфічны выбух.

А вінаватыя ў рэзкім павелічэнні колькасці гараджан трое маладых людзей, якія арганізавалі падпольную канцылярыю, дзе ўсяго за пяць тысяч рублёў кожны жадаючы мог атрымаць у пашпарце штамп аб прапісцы.

Ідэя зарабіць на жаданні многіх прыезджых стаць "віцябчанінам" узнікла ў двух сяброў. Прапанаваўшы трэцяму, супрацоўніку дывізійнай газеты, ажыццявіць свой план, яны пачалі дзейнічаць. Штамп быў выраблены ў друкарні і з'яўляўся "пасведчаннем" аб прапісцы ў Першамайскім раёне Віцебска.

Цяпер ваенная пракуратура вядзе следства па справе падпольнай прапіскі.

Сяргей НІКАНОРАЎ, Белінфарм.

г.Віцебск.

Прамень у гістарычнай спадчыне

Прыкладна 20 гадоў у колах навукоўцаў-гісторыкаў выношвалася ідэя стварэння рэспубліканскага часопіса. І вось, нарэшце, мары гэтыя здзейсніліся.

Убачыў свет першы нумар "Беларускага гістарычнага часопіса", прэзентацыя якога адбылася на мінулым тыдні.

Новае выданне, рэдагуе якое кандыдат гістарычных навук Васіль Кушнер, змяшчае гістарычныя даследаванні, палемічныя артыкулы па той ці іншай падзеі, з'яве.

Першы нумар часопіса выклікаў вялікую цікавасць у навукоўцаў і асабліва ў выкладчыкаў беларускай гісторыі ў школе.

Адам АСТАША.

Давайте уточним

Кому у нас жить хорошо,
или "Высший пилотаж" несуществующей авиакомпании "Энион-Дисна"

Под таким заголовком 10 июня в нашей газете был опубликован материал о том, как можно безбедно существовать, гоняя по кругу кредиты. И при этом даже заниматься благотворительностью.

К сожалению, в текст вкралась неточность.

Выпало всего лишь слово, и одна организация превратилась в другую. Поэтому мы хотели бы уточнить, что облагодетельствовали "герои" очерка поездкой в Швецию и двумя видеосистемами не Федерацию дзюдо Республики Беларусь, как было ошибочно напечатано в статье, а Федерацию дзюдо профсоюзов Республики Беларусь. Естественно, надо понимать, что и строительством коттеджей под Минском занимались дзюдоисты из профсоюзов.

Мы приносим извинения Федерации дзюдо Республики Беларусь, также просим принять уверения в том, что в "Народной газете" уважают истину так же, как и борцовский спорт.

Водгук

Які настаўнік, такія і вучні

Так нам падаецца вынік прачытання кволага артыкула Мечыслава Грыба ("Народная газета" N 104—105 ад 1 чэрвеня 1993 г.).

Няма неабходнасці аналізаваць агульныя разважанні — ушчуванні старшыні пастаяннай камісіі Вярхоўнага Савета. Грунтоўны адказ чытач можа знайсці ў артыкуле В.Жданко "Беларусь прапануюць купіць. За даўгі" ("Звязда", N 102 ад 1 чэрвеня 1993 г.). Як педагогі мы звярнулі ўвагу на падкрэсленае дэпутатам патрабаванне безумоўнага выканання законаў Рэспублікі Беларусь кожным грамадзянінам. Правільна і вельмі надзённа. Бо які настаўнік, такія і вучні. А шматлікія "настаўнікі" нашага парламента наўмысна не выконваюць Закон аб мовах. Грэбуюць матчынай мовай, спрабуюць ганьбіць дзяржаўныя сімвалы. Амаль не чуваць беларускага слова ад М.Грыба, ягоныя артыкулы зноў жа на расійскай. І тут ужо, калі ўшчуваць сваіх калег-дэпутатаў за невыкананне законаў, то трэба ў першую чаргу пачаць з сябе.

Што тычыцца калектыўнай бяспекі, то варта паслухаць і, галоўнае, пачуць беларускі народ. Няма ў нас жадання лезці ў ярмо ваеншчыны. Досыць дрыжаць, трэба будаваць заможнае жыццё ў сябе дома.

А.МОХАРАЎ, метадыст гарадскога метадычнага цэнтра. В.ЛЫСЯНОК, Н.ШАМЫЧАК, С.КРУПЕНЬКА, настаўнікі сярэдніх школ г. Гомеля.

Канстытуцыя: какой ей быть?

На сессии Верховного Совета Республики Беларусь прошла очередная дискуссия по проекту новой Конституции. Продолжают разговор на эту тему и читатели "Народной газеты".

С точки зрения философа

Власть и свобода.
Как избежать диктатуры

Владимир ГЛУШАКОВ, аспирант БГУ

Как мне представляется, сейчас ни у общества, ни у наших законодателей нет четкого представления об основных принципах строения и функционирования нашего государства — вопрос, каким ему быть, остается открытым. Свидетельство тому — колоссальный разброс мнений о будущей Конституции республики у одной части населения и апатия, психологическая усталость у другой.

Во-вторых, развитие событий "в самой политически стабильной" из бывших республик Союза привело к тому, что степень недоверия властям в целом, властным структурам со стороны населения стала критической. Назову лишь одну, даже не главную, на мой взгляд, причину этого — появление в соседних с нами странах Европы справочников для бизнесменов с указанием необходимых размеров "подарков" за те или иные услуги от служащих государственных учреждений республик бывшего Союза.

И наконец, в-третьих, как свидетельствуют данные многочисленных социологических опросов, а также собственные наблюдения, ни одна политическая группировка в настоящее время не располагает необходимой социальной базой для прихода к власти. Это, кстати, еще одно подтверждение отсутствия целостной концепции развития республики. Отсюда как следствие, возможность искусственных объединений различных группировок, представляющих свои клановые, узкогрупповые интересы, но отнюдь не отражающие интересов и потребностей избирателей, всего населения.

Все это делает чрезвычайно актуальным следующий вопрос: где проходит та грань, за которой государственное регулирование и планирование становятся государственным насилием по отношению к гражданам, и есть ли она вообще? Ответом на этот вопрос может явиться сопоставление следующих данных и их дальнейшая интерпретация. В опубликованном в январе 1985 г. Европейским форумом управления ежегодном отчете о состоянии экономики 28 промышленно развитых стран указывается, что распределение мест, занимаемых ими в соответствии со специально разработанным "индексом конкурентоспособности", непосредственно отражает чисто политический факт — кто стоит у власти. Все страны, где тогда у власти находились социалисты, откатились на более низкие места по сравнению с 1984 годом: Швеция — на одно место, Финляндия — на 4, Франция — на 4, Испания — на 5, Греция — на 7 мест. И наоборот, практически все страны, где у власти находились и находятся правые или правоцентристские правительства (в некоторых случаях лишь недавно сменившие своих предшественников), поднялись в таблице на несколько мест вверх или сохранили свою позицию.

Таким образом, налицо прямая зависимость между властью, а точнее — субъектами, ее представляющими, и их принципами, с одной стороны, и степенью экономического развития, экономической свободы — с другой. Посмотрим, какие же принципы лежат в основании государственного управления в тех и других странах.

В странах, которые поднялись вверх в своем экономическом развитии, главным является принцип правозаконности. В его основе лежит идея о том, что правительство в своей деятельности ограничено заранее установленными гласными правилами, дающими возможность любому человеку с большой точностью предвидеть, какие меры принуждения будут применять представители власти в той или иной ситуации. Исходя из этого, гражданин может уверенно планировать свои действия. Он знает также о своих незыблемых правах (праве на собственность, на социальную защиту и т.д.) и о том, что государство всегда защитит эти права. Только в таких условиях возможно подать в суд на президента страны и надеяться на успех (как было сообщено в нашей печати о прецеденте, имевшем место во Франции). Он понимает, что любой закон сужает индивидуальную свободу. Но правозаконность как раз ограничивает возможности правительства, не позволяет ему произвольно вмешиваться в действия индивидов, сводя на нет их усилия. Именно поэтому, несмотря на поправки в Билле о правах, конституция США остается одной из самых стабильных на протяжении последних 150 лет, предоставляя равные права и ответственность своим гражданам, без исключения.

Посмотрим теперь, на чем основывалось управление в странах, переместившихся вниз в таблице и особенно (это гораздо для них характернее) в бывших соцстранах.

Экономическое планирование коллективистского типа прямо противоположно тем принципам, которые мы рассмотрели, ибо в этой системе планирующие органы не могут ограничиться созданием возможностей. Они должны заботиться об актуальных, постоянно меняющихся нуждах реальных людей, а для этого принципы формального права не годятся. Они неизбежно зависят от обстоятельств, меняющихся очень быстро. Принимая решения, планирующие органы (власть) должны постоянно учитывать сложный баланс интересов различных групп и слоев населения. В этой ситуации неизбежно возникает основание для предпочтения одних интересов другим (конечно же, в интересах народа), затем эти основания становятся частью законодательства — рождаются привилегии, возникает неравенство, навязанное властью.

Любое планируемое общество — это общество, где отсутствует правозаконность в том смысле, что действия аппарата насилия, находящегося в руках у государства, никак не ограничены заранее установленными правилами. Это означает лишь одно — закон может (а в условиях централизованного управления экономикой должен) санкционировать произвол. Именно этот этап развития мы сейчас и переживаем. Наделяя правительство неограниченной властью, законодательно закрепляя тезис о том, что такой-то орган может действовать по "своему усмотрению", можно узаконить любой режим. Поэтому демократия, элементы которой у нас лишь недавно возникли, а не вызрели объективно, способна привести к установлению самой жесткой диктатуры. Как быть? Каким образом отстоять те немногие, еще незрелые демократические свободы, которые мы имеем, и сделать их устойчивыми? На мой взгляд, только путем компромисса как процесса, в рамках которого можно заложить основы правозаконности; найти общие для большинства населения ценности и идеалы, обеспечив тем самым социальную стабильность. Только эволюция общества к подлинной, гарантированной законами свободе выступает сегодня вариантом достижения данной цели не любой ценой, к чему нас всех приучили, а путем цивилизованным, подлинно человеческим. Именно сейчас в республике, несмотря на переживаемый экономический, политический и культурный кризис, как это ни парадоксально, возникла благоприятная ситуация для решения указанной проблемы. Что имеется в виду? Во-первых, существующая форма планового, в рассматриваемом нами варианте, управления несовместима с рыночной экономикой, становление которой продолжается. Во-вторых, сформировались новые группы собственников, предпринимателей, которые не смогут и не захотят больше терпеть над собой экономический диктат властей. В-третьих, общественное сознание прошло путь значительной эволюции, во многом отказавшись от прежних идеологических догм и штампов. Наконец, само геополитическое положение республики и ее включенность в общеевропейский процесс обязывают нас развиваться в предсказуемом для наших партнеров и соседей направлении, а это и есть путь демократического развития, становления правового государства.

Все это создает хорошие перспективы для будущего прогрессивного развития нашей республики. На предстоящих выборах в новые органы государственной власти необходимо стремиться к формированию коалиционного правительства на многопартийной основе. Его главной задачей должна быть работа по созданию правовой базы демократических реформ в интересах народа, создание такого механизма, который предусматривал бы его отставку в случае расхождения интересов между населением и правительством.

Все эти цели могут и будут реализованы. Дело лишь в том, какое время на это потребуется. Свобода общества определяется степенью свободы его граждан, каждого из нас. А мы еще так мало о ней знаем. Так давайте же стремиться к ней осознанно.

Я хачу сказаць

Каб без мяне мяне не ажанілі...

Нашы парламентарыі быццам зусім запамятавалі, хто іх выбіраў і каму, калі верыць дзеючай Канстытуцыі, належыць у рэспубліцы "ўся ўлада". Не, я не пра скасаванне рэферэндуму: тую пляму, якой самі сябе зняславілі шмат якія дэпутаты, ужо нічым не адмыць. Я пра тое, як Вярхоўны Савет вырашыў завяршыць работу над праектам новага Асноўнага Закона.

Я зусім не прыхільнік тых, хто лічыць, што патрэбна выносіць увесь Асноўны Закон на рэферэндум (дастаткова, лічу, правесці ўсенароднае галасаванне па двух-трох найбольш прынцыповых пытаннях). Але ж з тэкстам, які падрыхтаваны для разгляду на пасяджэнні парламента, трэба пазнаёміць усіх зацікаўленых грамадзян, інакш кажучы, абавязкова надрукаваць яго ў газетах. Такое рашэнне, калі гэта забылі зрабіць на сесіі, можа прыняць Прэзідыум Вярхоўнага Савета.

Так, праект Канстытуцыі ўжо быў абнародаваны ў жніўні мінулага года. Але ён зазнаў шэраг змен, аб якіх выбаршчыкі не ўсё ведаюць. А пасля таго, як у ім замацуюць так званыя асноўныя палажэнні (аб прэзідэнцкай рэспубліцы і іншыя), дарэчы, некалькі супярэчлівыя, як яго дапрацуюць з улікам новых прапаноў і паправак дэпутатаў, што тады застанецца ад той жнівеньскай публікацыі? Рожкі ды ножкі?

... Напісаў, а ў галаву лезе думка: можа, я дарэмшчыну ўзвёў на народных выбраннікаў, гаворачы аб іх забыўлівасці? Можа, яны наўмысна (па-іхняму, з добрых меркаванняў) рашылі, што няма ніякай рацыі знаёміць простых грамадзян з апошнім варыянтам праекта? Навошта, маўляў, народ бударажыць або, як яшчэ кажуць, гусей дражніць.

Дзякуй ім за гэтыя клопаты аб нас. Парламенцкая большасць заўсёды спасылаецца на "інтарэсы працоўных", калі ёй не даспадобы раіцца з выбаршчыкамі. Я ж асабіста не хачу быць пазбаўленым неад'емнага права выказваць свае думкі пра дзейнасць Вярхоўнага Савета і ўрада, атрымліваць разнастайную інфармацыю па важнейшых пытаннях дзяржаўнага жыцця. Мая хата, канешне, не параўнальная з Домам, дзе засядаюць уладатрымальнікі, але яна не з краю, як у той прымаўцы. І мне трэба ведаць усё, што тычыцца новага Асноўнага Закона маёй Бацькаўшчыны.

Генадзь ЛАГУНОВІЧ, афіцэр у адстаўцы, ветэран вайны і Узброеных Сіл.

Спецпадраздзяленне

У суправаджэнні ганаровага эскорту...

... У аэрапорце Мінск-2 высокага госця сустракалі кіраўнікі нашай дзяржавы. На лётным полі была выстраена ганаровая варта. Прагучалі гімны абедзвюх краін. Потым у суправаджэнні эскорту матацыклістаў прэзідэнт накіраваўся...
Усё гэта — абавязковыя атрыбуты падчас сустрэчы кіраўнікоў замежных дзяржаў. Яны ёсць у кожнай незалежнай краіне свету. Раней абавязкі па эскартаванню і суправаджэнню дэлегацый выконвалі супрацоўнікі сталічнай ДАІ рэспублікі. Цяпер, калі значна прыбавілася візітаў, узнікла неабходнасць стварыць спецпадраздзяленне — большае па колькасці, лепш падрыхтаванае і тэхнічна забяспечанае, экіпіраванае на належным узроўні.
Аглядальнік "Народнай газеты" Віктар ЧАРНУШЭНКА гутарыць пра гэта з камандзірам спецыялізаванага падраздзялення дарожна-патрульнай службы ДАІ МУС Рэспублікі Беларусь падпалкоўнікам міліцыі Міхаілам СВІСТУНОМ.

— Мы завяршаем фарміраванне двух узводаў, якія будуць заняты непасрэдна эскартаваннем (сустрэча і провады), а таксама суправаджэннем кіраўнікоў замежных дзяржаў у іх паездцы па нашай рэспубліцы. Колькасны склад спецпадраздзялення — 60 чалавек, усе афіцэры.

— Якія асноўныя прынцыпы адбору?

— Нам патрэбны прафесіяналы высокага класа, якія маюць вопыт работы ў аўтаінспекцыі, добра кіруюць матацыклам і машынай, фізічна і маральна вынослівыя, ростам не ніжэй 180 сантыметраў.

— Відаць, узніклі праблемы з матарызацыяй спецпадраздзялення?

— Яшчэ якія! На старых матацыклах маркі "Урал", што зараз ёсць, можна праводзіць хіба што толькі трэніроўкі. Патрэбны БМВ — высокакласная, надзейная тэхніка. Гэтыя матацыклы выкарыстоўваюць для эскартавання ў 113 краінах. Урад знайшоў магчымасць выдаткаваць валюту на іх закупку. Вядзём перамовы з кіраўніцтвам нямецкай фірмы. Яна гатова ў самы сціслы тэрмін выканаць заказ на 14—15 матацыклаў, пазначаных нашай дзяржаўнай сімволікай. Калі хопіць сродкаў, закупім і спецадзенне. Нам перададзены ўжо два "Форды", павінна быць яшчэ столькі.

— Чым будзе займацца спецпадраздзяленне, чакаючы высокіх гасцей?

— Работы хопіць. Па-першае, каб быць пастаянна ў форме, "прыгожа праехаць", трэба столькі праліць поту... Будзем праводзіць трэніроўкі ў сваім вучэбным цэнтры. На дарозе могуць узнікнуць розныя сітуацыі, нават такія, якія пагражаюць бяспецы суправаджаемых. Трэба быць гатовымі да ўсяго. Па-другое, адзін узвод будзе праводзіць кантроль на лініі, у тым ліку і за работай супрацоўнікаў ДАІ, выязджаць туды, дзе склаліся цяжкія дарожныя абставіны. У абавязках спецпадраздзялення — суправаджаць кіраўнікоў нашай дзяржавы ў час іх паездак, абслугоўваць розныя вялікія мерапрыемствы — фестывалі, злёты і інш., забяспечваць бесперашкодны праезд і ахову караванаў з грузам гуманітарнай дапамогі ад граніцы да месца прызначэння.

— Чым узброены эскарцёры?

— Звычайнай табельнай зброяй. Асабістая ахова суправаджаемых ускладзена на асобнае падраздзяленне. Для нас галоўнае — адпрацаваць маршрут і добра яго прайсці. Хоць, безумоўна, мы ўзаемадзейнічаем з іншымі службамі.

— І апошняе: калі можна будзе ўбачыць новы ганаровы эскорт з поўнай выкладкай?

— У вельмі хуткім часе, бо таго патрабуе прэстыж нашай незалежнай Беларусі.

Увага!

8 ліпеня 1993 г. у Мінску ў будынку Дзяржаўнага тэатра оперы і балета адкрыецца I з'езд беларусаў свету. З'езд праводзіцца ў мэтах далучэння інтэлектуальнага і эканамічнага патэнцыялу беларускай дыяспары да працэсу адраджэння незалежнай Беларусі.

